гаспадарчыя механізмы. Іх дзейнасць будуецца на прынцыпах даступнасці, добраахвотнасці, апоры на грамадскую ініцыятыву і самадзейнасць, на прынцыпах спалучэння індывідуальнай, групавой і масавай работы, галоснасці, кіравання і самакіравання, выкарыстання розных (законных) крыніц фінансавання, абавязковага ўліку мясцовых асаблівасцей у гістарычным і культурным развіцці, дыферэнцыяцыі і спецыялізацыі.

**Коган І.Л.,**
*суіскальнік кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ: ІДЭАЛ І ІЛЮЗІЯ

*Нацыянальная ідэя і нацыянальная культура.* Апошнім часам беларускае грамадства дужа займаюць пошукі шляхоў свайго культурнага адраджэння. Абвяшчаюцца лозунгі пра неабходнасць беларусізацыі ўсіх слаёў насельніцтва незалежна ад таго, да якой нацыі альбо да якой культуры належыць той або іншы індывід. Наколькі правамоцнае або, лепш сказаць, апраўданае такое, з аднаго боку, гвалтоўнае і шмат у чым фармалізаванае, а з другога, неабходнае дзеля культурнага адраджэння абеларушчванне шматнацыянальнага насельніцтва Беларусі дзяржавай?

Магчыма, пастаноўка гэтага пытання выкліча здзіўленне, але апошняе толькі пакажа на павярхоўнае стаўленне да такіх глабальных паняццяў, як культура, мова, нацыя. Мы маем мноства гістарычных прыкладаў, калі людзі, што працуюць на тэрыторыі Беларусі, або этнічныя беларусы, што жывуць за яе межамі, стваралі свае творы мастацтва зусім не ў межах беларускай культуры. Да іх можна аднесці такіх дзеячаў, як Казімір Семяновіч, што выдаў у 1650 г. у Амстэрдаме кнігу “Вялікае мастацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

артылерыі" і ўпершыню ў сусветнай навуцы стварыў праект шматпрыступкавай ракеты; Ілья Капіевіч, які працаваў па запрашэнні Пятра I і выдаў у Маскве больш за 20 кніг па граматыцы, рыторыцы і іншых дысцыплінах. Да іх жа можна аднесці і знакамітага Сімяона Полацкага, які фактычна быў пачынальнікам сілабічнай паэзіі ў Расіі і пашыральнікам ідэй барока ў духоўным жыцці. І хаця ён меў некалькі твораў на беларускай мове, асноўная яго дзейнасць абарачалася ўсё ж ва ўлонні расійскай культуры, асабліва калі ўлічваць, што сам Сімяон выхоўваў царскіх дзяцей і заснаваў тыпаграфію ў Крамлі. Можна ўспомніць Марка Шагала, што меў па сутнасці дзве радзімы. Асноўныя творы яго ствараліся па-за Беларуссю. І тым не менш нам ніхто не перашкаджае залічыць гэтых і іншых вялікіх людзей мінулага і цяперашняга часоў да беларускай культуры. Наадварот, мы ганарымся тым, што выхадцы з нашай краіны дасягнулі сусветнай вядомасці. І міжволі адчуваем неабходнасць у пашырэнні культурнай прасторы нашага народа і з удзячнасцю ставімся да дзейнасці нашых знакамітых суплямеННікаў.

З другога боку, іншапляменнікі, што воляй лёсу апынуліся ў арбіце і былі зачараваныя беларускай культурай, ахвяравалі сваю працу, свае творы беларускаму народу. У асноўным гэта былі людзі — носьбіты новых ідэй, часцей за ўсё з Еўропы часоў Адраджэння і Асветніцтва. І тым не менш прышлыя людзі і ідэі чужаземных культур не толькі не заглушалі беларускага каларыту, але, наадварот, узбагачалі, узнаўлялі беларускую культуру, дазвалялі ёй удыхнуць глыток свежага паветра ад культур іншых народаў дзеля таго, каб асіміляваць іх вопыт і дасягненні ва ўласных мэтах.

У самым павярхоўным выглядзе такі стан рэчаў у культуры можна назваць узаемапранікненнем розных па ўзроўні развіцця культур. Але больш глыбокі погляд на рэчы пакажа нам, што культура — гэта толькі твар народа, яго цела, яго знешняе адзенне. І ад таго, які дух у народа,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыі, племені, г.зн. этнасу, залежыць тое, якая ў яго і культура. З першага погляду можа падацца, што падобнае сцвярджэнне прыўносіць у аналіз культуры непатрэбныя і пустыя метафізічныя спекуляцыі. Аднак у рэальнасці погляд на культуру як на знешняе аблічча духу этнасу, як на праяву магчымасці спазнавальнасці народа, яго унікальнасці змяшчае ў сабе не большую метафізіку, чым любы разумовы аналіз. Да таго ж, само паняцце культуры мае ў сваёй аснове досыць вялікую долю метафізічнасці, нематэрыяльнасці сваіх вытокаў, бо ў гэтым паняцці абагульнены адзінкавыя з'явы, якія самі па сабе ні ў якой меры нельга назваць культурай з-за іх поўнай ізаляцыі ад усёй сукупнасці з'яў духоўнага жыцця народа. А любое абагульненне фармальна можна аднесці да метафізікі, калі гэтае абагульненае паняцце не будзе надзелена канкрэтным сэнсам і калі ў тым не будзе раскрыты яго глыбінны слой. Наш невялікі аналіз зусім не прэтэндуе на паўнату падобнага даследавання, і ўсё ж хацелася б намацаць суседнія з паняццем культуры сэнсы іншых паняццяў, якія ў многім вызначаюць паняцце культуры.

Значыць, мы бачым намаганне з боку дзяржавы ўкараніць па магчымасці глыбей аснову нацыянальнай культуры, мову, самыя карані грамадскага жыцця. У 1991 г. быў прыняты Закон аб мовах, у якім прадугледжваецца пераход сродкаў масавай інфармацыі, навучальных устаноў, з'ездаў і канферэнцый на беларускую мову. Безумоўна, такі крок прадыктаваны неабходнасцю адраджэння культуры, бо без мовы гаварыць пра самабытнасць культуры не даводзіцца. Але калі прыняць наш тэзіс аб тым, што культура — гэта знешняе аблічча народнага духу, дык, відавочна, трэба будзе зразумець, што ўвасабляецца ў дадзенай, канкрэтнай форме беларускай культуры. Канечне, убачыць сам дух народа немагчыма, таму што мы яшчэ не валодаем падобнымі органамі ўспрымання. Але ў пэўным сэнсе яго абрысы можна зафіксаваць праз гістарычныя прыклады, падзеі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

альбо з'явы глабальнага маштабу.

Любая гістарычная супольнасць людзей валодае нейкай сілай згуртаванасці паміж сабой і сілай проціпастаўлення сябе ўсім іншым. Гэтая нейкая ўнутраная сіла была б немагчымая па-за супольнасцю, па-за калектывам людзей: разрозненыя індывіды не здольныя супрацьпастаўляць сябе ўсяму свету, у той час як менавіта калектывы заўсёды адстойвалі сваё, нешта запаветнае, аж да фізічнага знішчэння іншых супольнасцей альбо для абароны сваёй уласнай сілы, альбо для пашырэння яе ўплыву на суседзяў. Геаграфічная прымета этнасу, яго кармячы і ўмяшчальны ландшафт, як казаў Гумілёў, не здатныя нарадзіць той унікальны стэрэатып паводзін, тыя традыцыі, якія вылучалі б дадзены этнас з усіх астатніх. Геаграфічныя асаблівасці адыгрываюць толькі дапаможную ролю, вызначаюць, так бы мовіць, характэрную асаблівасць істотных адметных рыс этнасу. Стэпавыя качэўнікі ў сваёй культуры схільныя выяўляць большую агрэсіўнасць і валявую накіраванасць, чым жыхары раўнін або прыбярэжных тэрыторый; жыхары пустынь ствараюць больш жорсткую, упартую ў сваёй непахіснасці культуру, чым насельнікі астравоў. Але не геаграфія вызначае культурную асаблівасць этнасу, а, калі можна так выказацца, сам этнас; праўдзівей, тая самая нябачная сіла, якая ўтрымлівае разам вялікі калектыў розных паводле ўзросту, характару і занятку людзей. Што прымушае мноства людзей адрозніваць сябе ад іншых? Чаму беларус супрацьпастаўляе сябе французу ці рускаму, хаця з апошнім яго звязваюць сваяцкія сувязі: агульнасць паходжання, блізкасць моўных формаў і рэлігійных уяўленняў, светапогляду і характару?

Гісторыя паказвае нам на тыя падзеі, што спрыялі ператварэнню раз'яднаных плямёнаў — нашых продкаў (дрыгавічоў, крывічоў, радзімічаў) — у нейкую цэласнасць, якая аказалася здольнай здзейсніць дзеянні сусветна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычнага маштабу. Няма сумненняў, што этнічныя цэласнасці, якія папярэднічалі з'яўленню новага этнасу, таксама валодалі своеасаблівасцю і унікальнасцю сваёй культуры, але ўліцца ў сусветна-гістарычны працэс змагла толькі новая цэласнасць, якая вырасла з каранёў этнічных прабеларусаў.

Такія старажытныя супольнасці людзей, як Полацкае або Тураўскае княствы, ужо да X ст. валодалі зайздроснай культурай, высокім узроўнем эканамічнага і палітычнага развіцця. Менавіта таму яны прыцягвалі сваіх суседзяў. Спачатку Кіеўская Русь, затым у Еўропе Тэўтонскі ордэн і ордэн мечаносцаў, якія аб'ядналіся ў Лівонскі ордэн; пазней Польшча і, нарэшце, Расійская імперыя па чарзе спрабавалі паняволіць і эксплуатаваць беларускія княствы, іх народ, культуру, нажытае спрадвечнаю працай багацце. І тым не менш беларуская культура нейкім неверагодным чынам здолела перажыць усе гістарычныя бедствы: катаклізмы і катастрофы, знішчэнні і рабства. Яна засталася цэласным арганізмам, хаця і надзвычай аслабелым і пазбаўленым многіх гістарычных патэнцый. Відаць, нябачная сіла, якая толькі і дазваляе называць супольнасць людзей этнасам, захавала нешта, што складае самое ядро любой нацыі.

Культура на тэрыторыі сучаснай Беларусі істотна змянялася ў сувязі з пранікненнем у яе культур іншых народаў. У розныя гістарычныя эпохі яе адрознівалі то прыцягальная сіла прастаты, то чароўны бляск раскошы. Але ў кожнае імгненне гісторыі беларуская культура доўжылася, непарыўна пераходзячы з адной формы ў другую, не менш прывабную, чым яе папярэдніца. Менавіта дзякуючы гэтай пераемнасці захавалася да гэтага дня тое, што мы маем права назваць беларускай культурай, чым маем права ганарыцца, што можам пакінуць у спадчыну нашым дзецям. Але сама па сабе пераемнасць, сувязь розных культурных формаў адной этнічнай супольнасці — гэта дзеянне той самай нябачнай сілы

этнасу, якую мы можам і павінны назваць яго духам, духоўнай сутнасцю. І пакуль існуе гэтая духоўная сутнасць, пакуль яна стварае самую субстанцыю культурнага тварэння і тчэ пераемнасць традыцый, да той пары этнічная цэласнасць (а значыць, і унікальная культура) будзе жыць і ствараць.

Зразумець гэтую духоўную сутнасць даволі цяжка, паколькі яна выяўляецца і можа быць зафіксавана адно ў значных падзеях гісторыі. Але нябачная сувязь гэтых падзей паміж сабой і іх непасрэднае дачыненне да культурнай супольнасці, этнасу, дазваляе вызначыць нейкі накірунак яе руху, убачыць гістарычную мэту народа — носьбіта культуры. Размова пра гістарычную мэту народа — гэта фактычна спроба пабудаваць філасофію гісторыі, што ў дадзены момант не ўваходзіць у нашы планы. Але сам напрамак думкі калі не раскрые, дык па меншай меры створыць умовы, пры якіх мы змаглі б ясней акрэсліць гістарычную накіраванасць і ролю культурнага станаўлення нашага народа ў сусветным культурным згуртаванні.

Наколькі нам вядома, значных спроб зазірнуць у "святую святых" народнай культуры ў гісторыі нашай краіны да гэтага часу не было (пры тым, што самабытнасць і унікальнасць беларускай культуры не пакідае ніякіх сумненняў). Мы ўжо сказалі, што выхад на сусветна-гістарычную арэну прабеларусы атрымалі толькі ў складзе буйных суперэтнасаў. Уласна, гэта датычыць любога народа бо чым больш магутны, глабальны, багаты і культурны народ, тым яго патэнцыі ў ажыццяўленні вялікіх гістарычных задач больш маштабныя. Значыць, культура непарыўна звязана з тым, у якой фармацыі знаходзіцца этнас — носьбіт і творца гэтай культуры. І зусім натуральна, што патэнцыі культуры павялічваюцца тады, калі пад яе аховай аб'ядноўваюцца некалькі народаў, уносячы нешта сваё ў скарбніцу ўжо агульнай культурнай традыцыі, цяпер ужо суперэтнасу. Але пры гэтым роля аднаго народа павінна быць вызначальнай і пануючай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такія аб'ектыўныя законы гісторыі, і, як бы нам ні хацелася, астатнія народы, а значыць, і іх культуры будуць абслугоўваць патрэбы галоўнай культуры. Так было і ў Кіеўскай Русі, і ў Вялікім княстве Літоўскім, і ў Рэчы Паспалітай, і ў Расійскай імперыі, і ў Савецкім Саюзе. Праўда, у Вялікім княстве Літоўскім і ў Рэчы Паспалітай беларуская культура была калі не вызначальнай, дык, ва ўсякім разе, магла свабодна развівацца на ўласную карысць. Менавіта ў гэтыя часы з'явіліся геніі, якімі былі створаны творы, вялікія не толькі на беларускай зямлі, але і далёка за яе межамі. Гэтая спадчына стала па сутнасці вяршыняй беларускай культуры, да адраджэння якой многія сёння імкнуцца і заклікаюць вярнуцца да яго і іншых. Будзе беларускае адраджэнне альбо не, мы не можам прадбачыць; але скарбы, якія захоўваюцца ў патаемных кутках беларускага этнасу, магчыма, стануць падставай для стварэння нейкай новай беларускай культурнай супольнасці. Аднак гэта справа будучыні, хаця, можа быць, і не такой ужо далёкай, як можа падацца; наша ж задача заключаецца ў тым, каб "злавіць за руку", зафіксаваць тую духоўную сутнасць, пра якую ідзе гаворка і якая, як нам здаецца, з'яўляецца прычынай і мэтай самой культуры ўсяго этнасу.

Мы вызначылі, што сіла згуртаванасці людзей істотна ўплывае на гістарычныя патэнцыі на маштаб гістарычнай місіі ўсяго народа. Як мы высветлілі, такая сіла згуртаванасці выявілася ў гісторыі праз стварэнне дзяржаў, у склад якіх у розных ролях уваходзіў беларускі этнас і ў станаўленні культур якіх ён удзельнічаў. Аднак дзяржаўнасць — гэта толькі знешняя, прымусовая сіла, якой заўсёды супрацьстаялі вальнадумцы і свабодалюбцы ўсіх часоў і народаў. Дзеля таго, каб дзяржава мела падобную сілу згуртаваць розных людзей, а тым больш народы, яго кіраўнікам неабходна было прапанаваць людзям пэўную праграму, лозунгі якой не толькі не супярэчылі б карэнным інтарэсам усіх людзей (і народаў)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дадзенай дзяржавы, але, наадварот, адпавядалі б іх сутнасным запатрабаванням. На першы погляд можа падацца, быццам такія лозунгі з'яўляліся б штучнымі і ніякай сілы пад сабой не мелі; аднак гісторыя даказвае, што дзяржава на дзіва мацнела, а культура мужнела і сталела тады, калі такія лозунгі арганічна спалучаліся з патрэбамі народа і кіраўнікі дзяржаў, якія іх абвяшчалі, шчыра аб'яўлялі гэтыя лозунгі мэтаю свайго жыцця. Так было пры вялікіх князях Гедыміне, Ягайле, Вітаўце. Пры іх народ аб'ядноўваўся, згуртаванасць яго павялічвалася ў шмат разоў, што дазваляла паспяхова здзяйсняць вялікія паходы, адстойваць уласную незалежнасць, а таксама натхняць творцаў на стварэнне вялікіх помнікаў культуры.

Аднак, апрача такіх лозунгаў, якія былі зразумелымі і маглі быць рацыянальна абгрунтаваны, у самім народзе (зусім не ў кожным) спела нейкая дзіўная думка — ідэя аб той або іншай гістарычнай місіі дадзенага этнасу, аб вялікай ролі дадзенай культуры ў будучыні, якая знікае з вачэй. Прыкладамі праяў такіх незразумелых, на першы погляд, ідэй могуць служыць Свяшчэнная Рымская імперыя германскай нацыі Карла Вялікага, што ажыццявіў гістарычную місію "аднаўлення" Рымскай імперыі ў новай якасці, альбо праваслаўная Расія, у якой у XV—XVI стст. пачала развівацца і ў XVII ст. аформілася ў пасланнях старца Філафея да вял. кн. Івана III і Івана Грознага гістарыясофская ідэя аб тым, што "Масква — гэта Трэці Рым". Здаецца, на беларускіх землях і ў беларускай культуры падобных ідэй не нараджалася, хаця ў гады росквіту Вялікага княства Літоўскага духоўны ўздым народа і культуры ў наяўнасці быў. Пазнейшае дамінаванне Польшчы і Расіі, у склад якіх мы ўваходзілі, ужо не дазваляла народу і яго лепшым мысліцелям аформіць тыя інспірацыі, якія зыходзілі з улоння беларускай культуры, ад яе духоўнай сутнасці, яе духу. Вось менавіта гэткія, на першы погляд фантастычныя, ідэі выяўляюць да пэўнай ступені подых гэтай духоўнай сутнасці кожнага этнасу

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

альбо суперэтнасу. Канечне, не кожны народ мае сусветна-гістарычныя патэнцыі, таму маштабы дзейнасці яго культурнай спадчыны значна больш сціплыя, чым у сусветных лідэраў, дзяржаў-суперэтнасаў, носьбітаў вялікіх сусветных культур. Але падобная ідэя, якую належыць назваць нацыянальнаю ідэяй, ёсць у культуры кожнага народа, якім бы малым або адсталым ён ні быў. Ёсць такая нацыянальная ідэя і ў беларускага народа.

Такім чынам, духоўная моц народа, якая выяўляецца ў яго этнічнай і культурна-гістарычнай згуртаванасці, упарадкуецца яго ўнутранай сутнасцю з дапамогай пэўнай нацыянальнай ідэі, якая заключае ў сабе сэнс культуры і мэту яго носьбіта, народа.

Спачатку гэтая нацыянальная ідэя адлюстроўваецца ў наіўных формах успрымання свету: у міфах, казках, легендах, хаця больш сталае разуменне іх сюжэтаў, або, па выказванні гісторыка Дзёміна, "археалагічны аналіз глыбінных сэнсаў", паказвае на нейкія таямнічыя, яшчэ да канца не разгаданыя сімвалы гістарычнай і метагістарычнай рэальнасці. Пазней, калі этнічная самасвядомасць дасягае больш сталых формаў, калі побач з міфалогіяй народ выкарыстоўвае рэлігійную, філасофскую і навуковую формы спасціжэння свету, нацыянальная ідэя часцей за ўсё раствараецца ў палітычных або эканамічных канцэпцыях. Заўважыць нацыянальную ідэю, высвеціць яе сапраўднае ззянне можна, калі адысці на дастатковую адлегласць ад прыватных, сітуацыйных версій развіцця краіны і яе народа. Погляд на этнагенез, які ўключае нараджэнне, развіццё і згасанне культурна-гістарычнай супольнасці, асэнсаванне гісторыі рэлігійных і грамадска-навуковых уяўленняў народа, цвярозая ацэнка сучаснай сітуацыі з пазіцыі надгістарычнай, або метагістарычнай,— вось метад, дзякуючы якому магчыма ўбачыць схаваную за прыватнымі гутаркамі рэальнасць духоўнай сутнасці народа і яго нацыянальнай ідэі.

*Самасвядомасць народа і нацыянальная ідэя.* На якім

бы этапе свайго развіцця ні знаходзіўся этнас (і яго культура), уключаючы сацыяльныя, палітычныя ці эканамічныя сферы яго жыцця, яго ўнутранай гістарычнай задачай з'яўляюцца выяўленне сваёй нацыянальнай ідэі, асэнсаванне яе сутнасных асаблівасцей і магчымасць яе гістарычнай рэалізацыі. Велізарнае шчасце для народа палягае ў тым, каб яшчэ на пачатку свайго гістарычнага шляху ўсвядоміць сваю ролю, ролю сваёй культуры ў сусветным культурным і этнагенетычным працэсе. Аднак, калі падобнае ўсведамленне ўласнай нацыянальнай ідэі адбудзецца ў сярэдзіне альбо ў канцы гістарычнага жыцця этнасу, задача будзе выканана хаця б напалову, пакінуўшы дакачваць другую палавіну гістарычнай задачы новаму этнасу, у якім знойдзе свой працяг дадзены народ. Таму не будзе перабольшваннем сказаць, што нашаму народу належыць заспяшацца і не толькі зразумець, але і рэалізаваць на практыцы тыя гістарычныя і метагістарычныя рэаліі, якія, магчыма, стануць здабыткам нашай самасвядомасці.

Нацыянальная ідэя існуе не проста так і не дзесьці ў паднябессі. Яна разлітая ў жывым целе народа і выяўляе сябе ў яго культурных формах: мастацтве, эканоміцы, палітыцы, грамадскай свядомасці, рэлігіі. Нацыянальная ідэя — гэта выяўленне духоўнай сутнасці кожнага этнасу, дух кожнага народа, яго рэальная духоўная сіла. Таму легкадумнае стаўленне да нацыянальнай ідэі як да малазначнай утопіі здатнае толькі нараджаць гістарычныя супярэчнасці, якія ў рэшце рэшт абарочваюцца для народа пакутамі, а для яго культурна-гістарычнай фармацыі — катастрофамі. І справа тут зусім не ў тым, што непрызнанне нацыянальнай ідэі, яе неасэнсаванне помсцяць свайму ж народу, а ў тым, што нацыянальная ідэя выяўляе ў сабе зусім канкрэтныя сілы, якія пры пашырэнні паняцця матэрыі можна назваць духоўна-матэрыяльнымі. Рэальная сіла, якая схавана за нацыянальнай ідэяй, мае цалкам упарадкаваную інфармацыйна-энергетычную структуру

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

накшталт генетычнай сілы. Генетычная інфармацыя мае ў сваім складзе не толькі інфармацыю, але і энергетычны запал велізарнай магутнасці, якую можа развіць з адной клеткі складаны арганізм. Але ў працэсе росту і далейшага існавання арганізма ў ім могуць адбывацца адхіленні ад нормы ў тых выпадках, калі гэтаму развіццю замінаюць узніклыя на яго шляху перашкоды. Сіла, што накіроўвае арганізм да развіцця закладзенай у ім формы, будзе ўсяляк імкнуцца пераадолець гэтую перашкоду, але пры няўдачы напрамак росту будзе скрыўлены, а арганізм набудзе пачварныя рысы. Гэтаксама і ў выпадку з нацыянальнай ідэяй: пакуль існуе яе носьбіт — народ, яе гістарычная місія і патэнцыял развіцця яшчэ ўсё захоўваюцца, а значыць, моц, у ёй увасобленая, будзе штурхаць культурны арганізм усё далей і далей, пакуль яна не вычарпае закладзеныя ў ёй сілы. Часта ў гісторыі, калі ў адных народаў узнікалі непераадольныя перашкоды ў рэалізацыі сваёй нацыянальнай ідэі, іх гістарычная місія перадавалася іншым народам, якія толькі пачыналі свой шлях да гістарычнай рэальнасці. Такая трагедыя ў гістарычным плане спасцігла ўсе культуры, якія сышлі з твару зямлі.

Беларуская культура працягвае існаваць і дагэтуль, таму можна зрабіць выснову, што наша нацыянальная ідэя яшчэ не вычарпала свае магчымасці, а значыць, у нас усё яшчэ застаецца гістарычны шанец рэалізаваць патэнцыял сваёй культуры ў сусветна-гістарычным маштабе. Такая надзея выказваецца не на пустым месцы: роля, якую іграла Беларусь у дзвюх сусветных войнах, была адной з самых трагічных і адначасова трыумфальных. Не выпадкова пасля другой сусветнай вайны Беларусь атрымала самастойны статус у ААН. І хаця функцыі Беларусі былі часцей за ўсё фармальныя, усё ж такое, нават фармальнае прызнанне яе ўсім светам гаворыць пра многае.

Іншымі словамі, можна канстатаваць, што, пакуль



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыве і развіваецца беларускі народ як культурная супольнасць дзесяці мільёнаў людзей, да таго часу ў нас заўсёды будзе заставацца магчымасць павярнуцца тварам да сваёй гістарычнай і духоўнай спадчыны, паспрабаваць усвядоміць сваю, у нечым абсалютна унікальную нацыянальную ідэю. Праўда, з цягам часу такая магчымасць усё больш растае ў гістарычнай мітусні, а сама нацыянальная ідэя размываецца ў сваіх межах спробамі гісторыкаў, культуролагаў даследаваць гістарычныя формы нашай культуры. Гэтыя формы шматстайныя і самі па сабе прываблівыя, але за канцэнтрацыяй увагі на іх сапраўдны змест, духоўная рэальнасць народа знікаюць з вачэй. Усведамляем мы нашу нацыянальную ідэю ці не, але трэба памятаць, што гэтая звышзадача — нацыянальнае самаўсведамленне, роўна як і рэалізацыя асноўных гістарычных задач беларускага этнасу, патрабуе сустрэчы з вока на вока са сваёй духоўнай сутнасцю, якая на працягу ўжо многіх стагоддзяў гаворыць з намі праз розныя формы культурных традыцый.

*Нацыянальная ідэя.* Не трэба думаць, што на некалькіх старонках і за некалькі гадоў можна наблізіцца да ўсведамлення сваёй духоўнай сутнасці і да яе выказвання ў нацыянальнай ідэі незалежна ад тых культурна-гістарычных формаў, якія яна прымала. Аднак самі па сабе спробы трэба рабіць увесь час, адну за другой, пакуль нарэшце не знойдзецца розум, здольны аб'яднаць намаганні многіх і выйсці на прамы шлях да сапраўднай рэальнасці, да нацыянальнай ідэі беларускай культуры. Такую спробу хацелі б зрабіць і мы, нягледзячы на тое, што глыбіня нашага даследавання яшчэ занадта далёкая ад той, якая патрабуецца.

Метагістарычная місія народа складваецца з сукупнасці прымет і характарыстык этнічнай цэласнасці. Гэта і культурна-палітычнае суседства, і геаграфічны ландшафт са сваімі рэсурсамі, і духоўная спадчына мінуўшчыны; нарэшце, гэта значныя гістарычныя падзеі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія могуць быць звязаны ў адно і інтэрпрэтаваны ў цэласнай сістэме прымет або ў адзіным напрамку.

Можна сцвярджаць, што гэтак жа, як і нараджэнне славян на стыку дзвюх гіганцкіх культурных супольнасцей — Захаду і Усходу, так і іх рассяленне ад вусця Дуная да Візантыі звязаны з пастаянным узаемадзеяннем то з заходняй культурнай традыцыяй, то з усходняй (у дадзеным выпадку мусульманскай). Самое нараджэнне славян адносіцца да IV—VI стст. нашай эры, калі з поўначы готы, а з усходу гуны пачалі сваю племянную экспансію ў цэнтр Еўропы. Да таго моманту ўжо склаліся два суперэтнасы, хрысціянска-візантыйскі і араба-мусульманскі. З гістарычнага пункту гледжання любое суіснаванне двух суперніцкіх светапоглядаў і культурных традыцый немінуча павінна было б павесці да "высвятлення адносін" паміж імі. Не будзем меркаваць, што магло б адбыцца, які суперэтнас знік або які з'явіўся б у выніку гэтых непасрэдных сутыкненняў хрысціянства з ісламам, аднак у любым выпадку такое сутыкненне трэба лічыць не толькі непажаданым, але катастрафічным.

Дзіўным чынам славяне з’явіліся менавіта ў тым месцы і менавіта ў той час, калі такое сутыкненне станавілася ўсё больш магчымым, бо пасля пропаведзі Мухамеда пачалася страшэнная мусульманская экспансія, што працягвалася амаль тры стагоддзі. Візантыя тады выстаяла ад націску арабаў, і іслам перакінуў свае сілы на другі фронт, спрабуючы зведаць шчасця іншымі, абходнымі шляхамі. Вольныя і жорсткія качэўнікі, якія паклалі пачатак новаму суперэтнасу — мангола-татарам — ужо пасля пачатку сваіх паходаў на Захад прынялі іслам. Але ў метагістарычным плане гэты перапынак у тры стагоддзі, паміж заканчэннем мусульманскай экспансіі на Захад праз Візантыйскую імперыю і пачаткам новай, мангола-татарскай экспансіі іслама, даў мажлівасць утварыцца і скласціся новаму, заходнееўрапейскаму суперэтнасу, які ў далейшым падараваў свету бліскучую культуру. Тады, у VII—IX стст., ісламу перапыніла шлях на Захад Візантыя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а ў XII—XIV стст.— Кіеўская Русь, у склад якой уваходзілі беларускія княствы Полацкае, Тураўскае і інш.

Значыць, адну са звышзадач усёй славянскай супольнасці ўяўляла неабходнасць перапыніць прасоўванне іслама, на Захад, чыя культура яшчэ нават не аформілася да таго моманту. Аднак з гэтай метагістарычнай задачы, якая "натуральна" легла на плечы славян, нарадзілася мноства магчымасцей, дзякуючы якім павінны былі рэалізавацца іншыя, не менш грандыёзныя задачы.

Натуральным вынікам славянскага ўмяшання ў гістарычныя справы стала ўзаемапранікненне розных (паводле сваіх прынцыпаў і задач) культур. Адстойваючы сваю незалежнасць, свае правы на свабодныя жыццё і творчасць, славяне пранікаліся чужымі для іх, але вельмі прываблівымі ідэямі. Прычым, хаця афіцыйныя сімпатыі (скажам, кн. Уладзіміра) былі на баку візантыйскага праваслаўя, тым не менш празаходнія ідэі каталіцызму, якія нёс на сваіх коп'ях Лівонскі ордэн, або ісламскія ідэі, што пранікалі ў культурную прастору славян праз нашэсце татар, знаходзілі сваю нішу побач з праваслаўем. Можа падацца дзіўным, што мы так акцэнтуем ўвагу на рэлігійнай гісторыі, але менавіта рэлігійныя ўяўленні да эпохі французскіх асветнікаў былі пануючымі ў светапоглядзе любога народа. Выходзіць, тая ці іншая адметная рыса ў рэлігійных уяўленнях аднаго этнасу ў параўнанні з другім служыла па сутнасці індыкатарам, па якім народы дзялілі ўвесь свет на "сваіх" і "чужых". Такое дзяленне і ляжыць у аснове выяўлення этнічнай супольнасці, а рэлігійныя вучэнні, якія спавядаюць народы, служаць для выказвання сваёй унікальнасці, як цяпер сцяг дзяржавы паказвае на яе самастойнасць і вылучае краіну з усяго свету.

Такім чынам, рэлігійная гісторыя, узятая на асобнай тэрыторыі, якую займала славянская культурна-гістарычная супольнасць (часткаю якой з'яўляецца беларускі народ), можа паказаць, што адбывалася за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"кулісамі" гісторыі, г.зн. за тымі ці іншымі падзеямі альбо прыватнымі ідэямі, якія пастаянна змянялі адна адну і так і не занялі — пануючага становішча ў дачыненні да іншай. А адбывалася тое, што самымі агульнымі словамі можна назваць кіпучаю актыўнасцю духоўнага жыцця. Менавіта на гэткі бурлівы стан у свядомасці таго часу паказвае змена то адной, то другой рэлігійнай канфесій, у выніку чаго на доўгі час настала рэлігійная "згода". Каталіцтва і праваслаўе "дамовіліся" паміж сабою,ператварыўшыся ў новы рэлігійны светапогляд, яшчэ да канца не ацэнены па сваіх гістарычных патэнцыях і выніках. Уніяцтва інтэрпрэтуецца сёння большасцю праваслаўных мысліцеляў і Маскоўскім патрыярхатам як уціск праваслаўнай традыцыі; тады як уніяцтва — гэта каталіцызм, увасоблены ў праваслаўныя формы. Можа быць, што тады уніяцтва і было ўціскам праваслаўя; можа быць, яно будзе такім жа ўціскам і сёння, калі б хто-небудзь наважыўся зноўку ажывіць яго формы. Але метагістарычна такое зліццё дзвюх галін аднаго вялікага вучэння не прайшло дарма, ды і адбыцца без далёкасяжных наступстваў яно не магло. Тут не да месца канфесійныя спрэчкі, але для далейшага гістарычнага развіцця, якое, бясспрэчна, звязана з грамадскай свядомасцю, што ўспрымае гісторыю вобразамі, уніяцтва мела велізарнае значэнне.

Еўрапейская культура была незалежнай культурнай супольнасцю, і, прыняўшы хрысціянскае вучэнне ў якасці асновы свайго светапогляду, яна надала выказванню хрысціянскіх ідэй своеасаблівую, унікальную форму, якая, уздзейнічаючы на еўрапейскую царкву, прымусіла апошнюю адпавядаць сваім культурна-гістарычным традыцыям. Менавіта гэтыя традыцыі ператварылі хрысціянства на еўрапейскай зямлі ў каталіцызм. Тое ж адбылося і з маскоўскім праваслаўем. Але беларуская супольнасць не належала поўнасцю ні да каталікаў (хаця каталіцызм не аднойчы заваёўваў сэрцы многіх тысяч



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларусаў і іх лідэраў), ні да праваслаўных, хаця ўжо некалькі стагоддзяў праваслаўе з'яўляецца афіцыйнай рэлігіяй беларускага народа. Татары, якія часткова аселі і на нашых землях і разбавілі свае культурныя традыцыі ў нашых, а рэлігійныя ўяўленні замянілі на пануючыя, таксама спрыялі пранікненню ў нашу культуру спецыфічных элементаў Усходу, якія мудрагеліста ўпрыгожвалі наш культурны арганізм. Уся гэтая рэлігійная актыўнасць розных элементаў і іх гістарычнае суседства на працягу доўгага перыяду не прайшлі бясследна. Па меншай меры два гістарычныя вынікі можна вылучыць з усяго набору яшчэ не да канца асэнсаваных наступстваў такой неверагоднай актыўнасці на беларускіх землях.

Па-першае, беларуская супольнасць зноў паўстала на шляху сутыкнення двух варагуючых этнасаў, на гэты раз рымска-каталіцкага і маскоўска-праваслаўнага. Шматлікія вайсковыя сутыкненні рускіх войскаў з Захадам (Швецыя, Лівонскі ордэн) мелі не толькі не глабальны характар, але і былі значна аслаблены менавіта за кошт геапалітычнага размяшчэння славянскіх земляў. Ні адна вайна ў гісторыі войнаў паміж Захадам і Расіяй не абыходзілася без удзелу беларускага этнасу ў той ці іншай ступені. Канечне, не трэба думаць, быццам бы беларусы заўсёды стаялі на варце абароны Расіі ад заходніх акупантаў. Наадварот, часцей за ўсё яны актыўна ўдзельнічалі ў ваенных паходах на рускія землі ў складзе празаходніх сіл Польшчы або Літвы. Гаворка ідзе толькі пра тое, што беларускі этнас сам па сабе быў дастаткова нейтральны ў дачыненні як Захаду, так і Расіі, з'яўляючыся часткова праваслаўным, а часткова каталіцкім, але ў той жа час ён уяўляў незалежную сілу этнічнага згуртавання. Менавіта гэтая незалежная сіла беларускага этнасу перагароджвала шлях любой агрэсіі альбо пранікненню ідэй адной культуры ў другую. Беларускі этнас нельга было проста праігнараваць, яго можна было заціснуць ваеннай сілай або прыцягнуць на свой бок абяцанкамі розных даброт. А

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта ўжо абазначала адцягненне сіл, у дадзеным выпадку ваенных сіл Захаду, ад непасрэднага ўварвання ў Расію: беларускі этнас рассейваў сілу цэласнасці заходніх агрэсараў, чым моцна паслабляў яе наступальны імпульс і дэзарганізоўваў ідэалагічную аснову тых, хто наступаў. Няхай гэткае вытлумачэнне падасца некаму моцным перабольшваннем, але нябачныя сілы этнічнай згуртаванасці заўсёды адыгрываюць ролю перашкоды для руху народаў альбо культур.

Па-другое, уся гісторыя існавання двух суперэтнасаў — заходняга і расійскага — сведчыць пра тое, што стаптаная іншаземцамі беларуская зямля ператварылася ў духоўны саган і, мажліва, у гістарычны духоўны палігон, на якім гістарычныя і метагістарычныя сілы спрабавалі выпрацаваць такія формы ўзаемадзеяння, якія ў далейшым маглі б зрабіцца асноўнымі ва ўзаемных дачыненнях культур. Так, уніяцтва, хаця і мела негатыўнае гістарычнае адценне, метагістарычна прадэманстравала магчымасць дыялогу і нават зліцця дзвюх этнічных супольнасцей, якія варагавалі паміж сабой.

А пастаянныя ваенныя паходы Захаду на Усход альбо, наадварот, Усходу на Захад сталі звязвацца ў свядомасці з цяжкасцямі, якія трэба пераадолець раней, чым аднаму дасягнуць другога. Цяпер, у стагоддзе звышхуткаснага транспарту, гэты аргумент можа падацца смешным, але сёння і Беларусь узнялася ў якасці стрымліваючага фактару на новую, больш высокую прыступку. Беларусь — агульнапрызнаная самастойная дзяржава са сваёй культурай і традыцыямі, народам і яго дасягненнямі, і ніхто не можа адкідаць чалавечы фактар у навязванні тых альбо іншых прынцыпаў або ідэй. Сёння прымаць рашэнні пра экспансію той ці іншай культуры можна толькі з улікам фактару Беларусі, якая зрабілася самастойным сусветна-гістарычным фактарам як дзяржава, што знаходзіцца на сумежжы вялізных культурных масіваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так дзіўным чынам геаграфічнае размяшчэнне беларускіх земляў і характар беларускай культуры, які пачаў складвацца некалькі стагоддзяў назад, натуральна падштурхнулі беларускі этнас да рэалізацыі закладзеных у ім патэнцый. Тыя нешматлікія бакі сапраўды бязмежнай паводле зместу нацыянальнай ідэі, якія мы толькі акрэслілі, на самай справе могуць раскрыць рэальныя магчымасці нашага этнасу, нашай культуры. Больш таго, усведамленне гістарычнай місіі, якое магчыма толькі пры дасягненні нашым народам глыбокай самасвядомасці, дазволіць захаваць настолькі каштоўныя духоўныя сілы беларускай культуры і накіраваць іх на сапраўдныя, а не эфемерныя задачы культурна-гістарычнага будаўніцтва. У гэтым глабальным працэсе не можа быць капіравання альбо простага прыняцця вопыту іншых народаў, бо унікальнасць кожнага этнасу спрадвечна вызначана сукупнасцю гістарычных, геаграфічных, часавых, геапалітычных і іншых прымет. Акрамя таго, любое запазычанне прывабных паводле формы дасягненняў іншых культур адыграе ролю той самай перашкоды, пра якую ішла гаворка трохі вышэй і якая перакрывае шлях да правільнага развіцця культурнага арганізма. Гэта ж адкрывае шлях да няправільнага, ілюзорнага ўяўлення пра спосабы і формы гістарычнага і культурнага станаўлення нашага народа. Толькі распрадмечаны, усвядомлены сэнс нацыянальнай ідэі і стварэнне адпаведных ёй культурных формаў дапамогуць адрадзіць беларускую культуру і ў той жа час арганічна прыцягнуць да гэтага працэсу тых, хто не ўспрыняў уплыву духоўнай сутнасці нашага народа або хто зачараваны суседнімі культурамі. Мяжа паміж ідэалам культуры і ілюзіямі, згодна з якой можна амаль механічна адрадзіць культурныя карані нашага народа, насаджаючы ўсюды пустыя культурныя формы без іх духоўнага зместу, вельмі тонкая, і ў той жа час яна ўтварае бездань паміж сапраўдным ідэалам і яго падменай. Гістарычная мудрасць і ёсць менавіта ў тым, каб не падпасці пад уздзеянне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нагэтулькі прываблівай ілюзорнасці, што зыходзіць ад знешняй прастаты беларускага адраджэння, змагчы накіраваць свае сілы на дасягненне няхай сабе і складанага, але арганічна ўласцівага духу нашага народа ідэалу.

Сказанае вышэй толькі пачатак, бледнае набліжэнне да ўсведамлення сваёй нацыянальнай ідэі, рух да сапраўднай нацыянальнай самасвядомасці — свядомасці народа, які разумее і рэалізоўвае тое, што прызначана яму спадаром Лёсам і чаго чакае ад яго ягоная ж духоўная сутнасць.

**Пілевіч Г.М.,**
*суіскальнік кафедры культуралогіі і сацыялогіі*

## У ЧЫМ ТВАЯ ВЕРА?

Не будзе адкрыццём, калі скажам, што літаральна за апошнія некалькі дзесяцігоддзяў прыкметна змяніліся, калі так можна сказаць, адносіны паміж чалавекам і мастацтвам. Гэтаксама, як, між іншым, змяніліся адносіны між тымі, хто стварае мастацтва, і яго аматарамі, "спажыўцамі". Жыццё сведчыць: з кожным годам, асабліва з пачаткам так званай перабудовы, "творы" масавай сурагатнай культуры, нягледзячы на пратэсты свядомай грамадскасці, усё больш і больш запаланяюць кіна- і тэлеэкраны, кнігарні, абвальваюцца на старонкі перыядычных выданняў. Не сакрэт таксама, што такія "творы", накіраваныя на разбурэнне чалавечага духу і традыцыйнай чалавечай маралі, узбагачаюць, і даволі моцна, як іх аўтараў, так і розных камерсантаў, гандляроў і г.д.

Як вядома, у многіх краінах, на дзяржаўным узроўні падтрымліваецца сапраўдная культура, і, як кажуць, там маральнасць насельніцтва на даволі высокім